# БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА

**В. Д. Бухцілава, С. А. Сігаева**

## ДЭТЭКТЫЎНЫ КАНОН У СУЧАСНАЙ ДЗІЦЯЧАЙ ПРОЗЕ (ВАЛЕРЫЙ ГАПЕЕЎ «ЗНІЧ ВАЎКАЛАКА»): НАЦЫЯНАЛЬНЫ КАЛАРЫТ

Эпоха зацвярджэння дэтэктыва як цэласнага і самастойнага жанру – гэта эпоха рамантызму, якая папярэднічала асветніцкаму рэалізму з усімі тэндэнцыямі яго развіцця і прасвятлення асобы, на фоне якой нарадзіўся дэтэктыў. Вылучэнне характару "чыстага дэтэктыва" дастаткова складаны працэс сярод самых розных відаў дэтэктыва: "шпіёнскі", "сур'ёзны", "чорны", крымінальны і інтэлектуальны раманы. Аўтарамі першых дэтэктываў былі амерыканскія пісьменнікі Э. По, У. Колінз, Г. Чэстэртан. Класічным узорам гэтага жанру сталі творы англійскага пісьменніка А. Конан Дойла і А. Крысці.

Гісторыя беларускага дэтэктыва пачынаецца значна пазней, алеэвалюцыянуе жанр дастаткова хутка: ад класічнага дэтэктыва да напрамкаў, створаных пад уплывам беларускай гісторыі, а часам і міфалогіі (гэтаму спрыяе багатая наша спадчына), а таксама крымінальныя, гістарычныя, палітычныя і гумарыстычныя дэтэктывы.

У. Караткевіч, М. Чаргінец, В. Праўдзін, А. Глобус, М. Адамчык, У. Сіўчыкаў, Л. Рублеўская, М. Клімковіч, Г. Кісліцына і інш. сталі вядомымі беларускімі майстрамі дэтэктыва.

Жанравымі адзнакамі дэтэктыва можна назваць наступныя: пастаноўка ў творы трох знакавых пытанняў, якія ствараюць пэўны стандарт пабудовы сюжэту (Хто? Як? Чаму?); наяўнасць таямніцы, загадкавага здарэння, чатырохэтапнай кампазіцыйнай структуры, цесная ўзаемасувязь інтрыгі, фабулы, сюжэта; стварэнне ў чытача напружання, адпаведнага эмацыйнага стану; кола характэрных персанажаў (Вышукнік, Злачынец, Ахвяра). Ствараюцца дэтэктыўныя раманы па строга вызначаных канонах. Сярод іх наступныя: чытач павінен мець роўныя са следчым магчымасці для разгадкі таямніцы злачынства; усе ключы да разгадкі павінны быць ясна вызначаны і апісаны; у дэтэктыўным рамане павінен быць дэтэктыў, які высочвае і расследуе; без трупа ў дэтэктыўным рамане проста не абысціся; таямніца злачынства павінна быць раскрытая выключна матэрыялістычным шляхам; у любы момант разгадка павінна быць відавочнай, пры ўмове, што чытачу хопіць пранікліваcці разгадаць яе.

У сучаснай дзіцячай прозе дэтэктыўны жанр прадстаўлены прыгодніцкай аповесцю Валерыя Гапеева "Зніч ваўкалака" (2020). Аповед можна разглядаць як удала рэалізаваную мадэль класічнага дэтэктыва.

Сюжэт аповеду мае выразныя прыкметы "Сабакі Баскервілей" А. Конан-Дойла. Аўтар стварае інтэлектуальнае напружанне для падлеткаў, уклю-

чаючы ў сюжэт цэлы шэраг таямніц. Гарадскі хлопец Стась прыехаў на лецішча прыглядаць за агародам і кветкамі, пакуль бацькі адпачываюць у Турцыі. Пазнаёміўся з мясцовымі равеснікамі. У гэты час у вёсцы пачалі адбывацца непаразуменні: чупакабра, або ваўкалак, як называюць старыя людзі, пачала душыць коз і курэй. А яшчэ і знікла студэнтка з фальклорнай экспедыцыі. Апантаныя і кемлівыя падлеткі актыўна пачынаюць разгадваць таямніцы і ўключаюцца ў пошукі дзяўчыны. Займальны і таямнічы сюжэт аповесці адпавядае дэтэктыўным канонам. Чацвярым сябрам-тынэйджарам трэба не толькі разгадаць шыфр і знайсці ахвяру невядомага звера, але і адкрыць старажытную таямніцу, а потым вырашыць: што рабіць са знойдзеным скарбам, бо “…без зніча роду нашаму не жыць”. Ненавязліва аўтар пагружае чытача ў міфалогію, якая пераплятаецца з сучаснасцю, адлюстроўчаючы тое, што ў кожнай легендзе зашыфравана шмат важнай інфармацыі. Аўтар уводзіць у аповед элементы містыкі і звышнатуральнага, чым стварае складанае перапляценне рэальнага, дэтэктыўнага і містычнага, а выкарыстоўваючы сімвалічныя вобразы і з’явы (ваўкалак, старажытнае капішча, зніч, дуб) пісьменнік хоча звярнуць увагу на надзённыя, экалагічныя і маральна-этычныя праблемы.

Перад юнымі героямі паўстане дылема: або праслävіцца, абнародаваўшы свае адкрыцці пра адзінае старажытнае капішча з цудадзейным знічам, або прамаўчаць і захаваць народную святыню ад хцівых людзей. Знайсці, а пасля і сцерагчы, каб агонь не пагас, каб абы-хто да яго не лез, каб не паскудзілі на святым месцы – значыць здзейсніць абавязак перад сваімі дзядамі, сцвердзіць сябе вартымі быць нашчадкамі беларусаў. Героі аповесці з’яўляюцца выразнікамі адраджэнскай ідэі. Іх мэта простая: “...даказаць усім, што беларусы ва ўсякім разе не горшыя за ўсіх астатніх”. У аснову адраджэння нацыі ставіцца паганская вера прадзедаў і прамоўлена яна вуснамі герояў, якія маюць не менш беларускія імёны (Стась, Віталь, Яніна).

Дэтэктыўныя і містычныя элементы ўтвараюць сюжэтна-кампазіцыйную структуру аповесці В. Гапеева. Сюжэт складаецца з перапляцення падзей, часам містычных, для якіх падлеткі з дапамогай свайго розуму і ведаў старэйшага пакалення знойдуць тлумачэнне: у ім і закінутая ракетная база, і самотны сталкер, і жанчына “вядзьмарка”, якая дапамагае яму, ітаражытнае капішча з цудадзейным знічам.

Такім чынам, у творы некалькі планаў: класічны дэтэктыў і дэтэктыў, зарыентаваны да беларускай знакавай і культурнай прасторы.

Дэтэктыўны пачатак адыгрывае важную ролю ў рэалізацыі мастацкай ідэі і надае аповеду напружанасць і дынамізм. Аповед не проста створаны па сфармуляванай тэхніцы напісання падобных тэкстаў. У ім тэхналогія арганізацыі класічнага дэтэктыва суіснуе з мастацкай рэалізацыяй культурна-знакавых праяў, якія дазваляюць нам казаць пра беларускую прастору дэтэктыва, напісанага на манер яго заснавальнікаў Э. По, А. Конан Дойла, А. Крысці.